Отдел научно-методического обеспечения
общего среднего образования
и образования лиц с ОПФР
УО РИПО

# Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў (дысцыплін) «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» ва ўстановах ПТА і ССА ў 2018/2019 навучальным годзе» (метадычныя рэкамендацыі)

Метадычныя рэкамендацыі падрыхтаваны ў адпаведнасці з інструкцыйна-метадычным пісьмом Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі «Аб арганізацыі ў 2018/2019 навучальным годзе адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў і правядзенні факультатыўных заняткаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі» (зацверджана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 13 ліпеня 2018 г.) з улікам асаблівасцей арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесіянальна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі (далей – установы ПТА і ССА).

***Звяртаем увагу***, што згодна з загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 291 ад 12.04.2018 г. “Аб зацвярджэнні зместу агульнаадукацыйнага кампаненту вучэбных планаў по спецыяльнасцях прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі” вучэбнымі планамі ўстаноў ПТА і ССА на вывучэнне беларускай мовы і беларускай літаратуры ***адводзіцца наступная колькасць вучэбных гадзін***: беларуская мова – **72,** беларуская літаратура **– 78.** Па спецыяльнасцях профілю “Мастацтва і дызайн”, “Гуманітарныя навукі” адпаведна **86** і **108** гадзін. Па беларускай мове прадугледжаны **2** абавязковыя кантрольныя работы, па беларускай літаратуры таксама **2** (па спецыяльнасцях профілю «Мастацтва і дызайн» адпаведна **2** і **3**). АКР праводзяцца за кошт часу, адведзенага вучэбным планам на вучэбны прадмет (дысцыпліну). Акрамя таго, працэс навучання прадугледжвае правядзенне навучальных, праверачных і іншых відаў работ у рамках паўрочнага кантролю, а таксама дыктантаў, пераказаў, тэставых работ у рамках тэматычнага кантролю.

Асноўнымі мэтамі моўнай і літаратурнай адукацыі ва ўстановах ПТА і ССА з’яўляюцца:

фарміраванне сістэмы ведаў пра мову і маўленне, уменняў карыстацца беларускай мовай ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці, развіццё камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай і мастацка-эстэтычнай культуры вучняў;

далучэнне вучняў да мастацтва слова і фарміраванне на гэтай аснове мастацкага мыслення, эстэтычных пачуццяў, чытацкай і маўленчай культуры, выхаванне чалавека з глыбокім гуманістычным светапоглядам, з развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі.

***Ва ўстановах, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы ПТА і ССА,*** выкладанне беларускай мовы і літаратуры ажыццяўляецца ў адпаведнасці з

**вучэбнымі праграмамі** (Пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 27.07.2017 г. №93):

Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Беларуская мова і літаратура. X–XI класы (базавы ўзровень). – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2017.

Вучэбныя праграмы змешчаны на нацыянальным адукацыйным партале *www.adu.by / Образовательный процесс. 2018/2019 учебный год / Учебные предметы. V—XI классы.* ***Беларуская мова*** ***(Беларуская літаратура)***.

**Рэкамендуюцца наступныя вучэбныя дапаможнікі:**

Беларуская мова: вучэб. дапам. для 10-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2016,

Беларуская мова: вучэб. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2016,

Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 10-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / З.П. Мельнікава [і інш.]; пад рэд. З.П. Мельнікавай, Г.М. Ішчанка. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2016,

Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / З.П. Мельнікава [і інш.]; пад рэд. З.П. Мельнікавай, Г.М. Ішчанка. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2009.

У дапамогу выкладчыку прапануецца тэматычнае планаванне па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура», размешчанае на адукацыйнам партале РІПА (http://ripo.unibel.by/index.php?id=2812).

Выкладчык мае права ў межах вучэбных гадзін, што адводзяцца на вывучэнне вучэбнага прадмета (дысцыпліны), уносіць у планаванне абгрунтаваныя змены.

Аб’ём кантрольных работ (дыктант, пераказ), слоўнікавага дыктанта, кантрольнага сачынення ўказаны ў **Метадычных рэкамендацыях па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення** ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі (зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 06.06.2016 г., надрукаваны ў «Настаўніцкай газеце» 2 ліпеня 2016 года, размешчаны на сайце Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь: http://edu.gov.by/page-26461).

Звяртаем ўвагу на тое, што пры засваенні адукацыйных праграм ПТА і ССА з атрыманнем агульнай сярэдняй адукацыі ў ліку абавязковых экзаменаў навучэнцы **могуць здаваць экзамен** па вучэбным прадмеце (дысцыпліне) «Беларуская мова». Дадзены экзамен праводзіцца ў форме пераказу, які ацэньваецца дзвюма адзнакамі: адна – за змест, другая – за граматнасць.

Працэдура выстаўлення адзнак ва ўстановах прафесійнай адукацыі пры рэлізацыі адукацыйных праграм ССА **аднолькавая** для навучальных дысцыплін агульнаадукацыйнага і прафесіянальнага кампанентаў вучэбнага плана Па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова» адзнака вызначаецца як сярэдняе арыфметычнае адзнак за змест і граматнасць, атрыманных на экзамене за пераказ. Дадзеная адзнака выстаўляецца ў экзаменацыйную ведамасць і ў дадатак да дыплома аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У выпадку, калі

навучэнец не здаваў экзамен, адзнака па дадзенай вучэбнай дысцыпліне вызначаецца як сярэдняе арыфметычнае адзнак за семестры і выстаўляецца ў дадатак да дыплома аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Ва ўстановах прафесійнай адукацыі пры рэалізацыі адукацыйных праграм ПТА выніковая адзнака па вучэбным прадмеце «Беларуская мова», калі навучэнец здаваў экзамен, вызначаецца з улікам гадавой і экзаменацыйнай адзнак: на ўзроўні адзнакі за экзамен, калі гадавая адзнака ніжэй экзаменацыйнай; на ўзроўні гадавой, калі экзаменацыйная адзнака ніжэй гадавой. У выпадку, калі розніца паміж гадавой і экзаменацыйнай адзнакамі складае два і больш балаў, выніковая адзнака вызначаецца як сярэдняе арыфметычнае экзаменацыйнай і гадавой адзнак. Выніковая адзнака адпавядае гадавой, калі навучэнец не здаваў экзамен. Выніковая адзнака выстаўляецца ў дадатак да дыплома аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Установы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы ССА, экзаменацыйныя матэрыялы для правядзення экзаменаў у пісьмовай форме атрымліваюць у Рэспубліканскім інстытуце прафесіянальнай адукацыі ў адпаведнасці з заяўкамі, якія накіроўваюцца за два месяцы да пачатку экзаменацынай сесіі ў аддзел навукова-метадычнага забеспячэння агульнай сярэдняй адукацыі і адукацыі асоб з АПФР. Форма заяўкі размешчана на рэспубліканскім партале «Профессиональное образование» па адрасе: http://ripo.unibel.by/index.php?id=2643 (Информация о порядке получения пакетов экзаменационных материалов по белорусскому, русскому языкам, математике для учреждений среднего специального образования).

Для арганізацыі і правядзення **факультатыўных заняткаў** настаўнікі могуць карыстацца праграмамі і вучэбна-метадычнымі комплексамі для X і XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, рэкамендаванымі Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі РБ. Матэрыялы размешчаны на Нацыянальным адукацыйным партале: *www.adu.by / Настаўніку / Вучэбна-метадычнае забеспячэнне дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі / Вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў / Вучэбны прадмет.*

Пры планаванні і арганізацыі пазакласнай работы па беларускай мове і літаратуры рэкамендуем звярнуць увагу на каляндар юбілейных дат, каляндар міжнародных і дзяржаўных свят.

***Каляндар юбілейных дат беларускіх пісьменнікаў***

| | |
|---|---|
| ***верасень*** | 125-годдзе з дня нараджэння Андрэя Мрыя<br>105-годдзе з дня нараджэння Сяргея Грахоўскага<br>80-годдзе з дня нараджэння Анатоля Грачанікава<br>75-годдзе з дня нараджэння Ніны Мацяш |
| ***лістапад*** | 85-годдзе з дня нараджэння Вячаслава Адамчыка<br>70-годдзе з дня нараджэння Яўгеніі Янішчыц |
| ***снежань*** | 220-годдзе з дня нараджэння Адама Міцкевіча |

| | |
|---|---|
| | 100-годдзе з дня нараджэння Кастуся Кірэенкі<br>95-годдзе з дня нараджэння Анатоля Вялюгіна<br>75-годдзе з дня нараджэння Казіміра Камейшы |
| ***студзень*** | 150-годдзе з дня нараджэння Ядвігіна Ш.<br>120-годдзе з дня нараджэння Міхася Лынькова<br>115-годдзе з дня нараджэння Алеся Якімовіча<br>100-годдзе з дня нараджэння Васіля Хомчанкі<br>100-годдзе з дня нараджэння Алеся Савіцкага |
| ***люты*** | 105-годдзе з дня нараджэння Аркадзя Куляшова |
| ***сакавік*** | 100-годдзе з дня нараджэння Міколы Лупсякова<br>90-годдзе з дня нараджэння Еўдакіі Лось<br>65-годдзе з дня нараджэння Міколы Мятліцкага |
| ***май*** | 115-годдзе з дня нараджэння Паўлюка Труса |
| ***чэрвень*** | 95-годдзе з дня нараджэння Васіля Быкава<br>85-годдзе з дня нараджэння Віктара Карамазава |

***Каляндар міжнародных і дзяржаўных свят***

| | |
|---|---|
| ***2 верасня*** | Дзень беларускага пісьменства |
| ***8 верасня*** | Міжнародны дзень пісьменнасці |
| ***21 лютага*** | Міжнародны дзень роднай мовы |
| ***3 сакавіка*** | Сусветны дзень пісьменніка |
| ***21 сакавіка*** | Сусветны дзень паэзіі |
| ***27 сакавіка*** | Сусветны дзень тэатра |
| ***2 красавіка*** | Міжнародны дзень дзіцячай кнігі |
| ***18 мая*** | Сусветны дзень музеяў |

Поўная інфармацыя аб вучэбна-метадычным забеспячэнні вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» ў 2018/2019 навучальным годзе змешчана на нацыянальным адукацыйным партале *www.adu.by / Образовательный процесс. 2018/2019 учебный год / Учебные предметы. V—XI классы. Беларуская мова* (***Беларуская літаратура***).

Падрыхтаваныя і выдадзеныя ў серыі «Кампетэнтнасны падыход» дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы па беларускай мове і літаратуры прызначаны для фарміравання прадметных кампетэнцый і накіраваны на засваенне вучнямі вучэбнага матэрыялу праз розныя віды дзейнасці: пазнавальную, камунікатыўную, пошукавую, творчую і інш. Дыягнастычныя матэрыялы прызначаны для праверкі і ацэнкі адукацыйных вынікаў пры ажыццяўленні бягучага і прамежкавага кантролю і могуць выкарыстоўвацца ў працэсе як франтальнай, так і індывідуальнай або групавой работы.

Актуальную інфармацыю для вывучэння і выкарыстання ў педагагічнай практыцы можна знайсці ў раздзеле «Дистанционный всеобуч для учителя», які размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале ў раздзеле *«Электроннае навучанне»*, а таксама па адрасе*:*

*http://e-asveta.adu.by/.*

Метадыст аддзела
Таццяна Сяргееўна Капялевіч
**+375 17 200 05 99**